Дзяржаўная ўстанова культуры
“Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка
Асіповіцкага раёна”
*Цэнтральная раённая бібліятэка*

*Серыя «Героі Савецкага Саюза – вызваліцелі Асіповіцкага раёна»*

# У ПАМЯЦІ НАШАЙ ГЕРОІ ЖЫВЫЯ



## МАТРОСАЎ Аляксандр Аляксеевіч

# МАТРОСАЎ
# Аляксандр Аляксеевіч

**(22.6.1918 – 05.02.1992)**

## БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА



**Нарадзіўся 22 чэрвеня 1918 года ў горадзе Іванава (Расія) ў сям'і ткача. Закончыў школу №47**



**Працаваў памочнікам майстра на ткацкай фабрыцы імя С.М.Кірава.**

**У верасні 1938 года прызваны ў Чырвоную Армію. Службу праходзіў артылерыйскім майстрам у 59-м асобным артылерыйскім дывізіёне.**

**Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны з жніўня 1941 года.Удзельнічаў у абароне Ленінграда, абараняў Маскву. З сакавіка 1943 года старшы сяржант Матросаў выяўляў камандзірам узвода разведкі 94-й асобнай разведвальнай роты 82-й**

**стралковай дывізіі. Асабліва вызначыўся ў баях за вызваленне Беларусі летам 1944 года. 24 сакавіка 1945 года прысвоена. Званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна леніна і медалі “Залатая Зорка”.**

**Вызваляў Польшчу, дабіваў ворага ў Германіі, штурмаваў Берлін.**

**У чэрвені 1946 года старшына Матросаў звольнены ў запас.Вярнуўся ў родны горад.З 1949 года працаваў памочнікам майстра на тэкстыльнай фабрыцы імя Балашова. З 1981 года– на заслужаным адпачынку.**



**Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонай Зоркі, 20-ма медалямі “За адвагу”.**

**Памёр 5 лютага 1992 года. Пахаваны на могілках Баліно ў г.Іванава.**

**У маі 2010 года на доме, дзе апошнія гады жыў Герой, адкрыта мемарыяльная дошка.Помнік**

**Герою ўстаноўлены таксама на “Алеі Герояў” у г.Асіповічы Магілёўскай вобласці.**




***Мемарыяльная дошка на доме дзе жыў А. А. Матросаў***




***Помнік Герою на могілках Баліно ў г.Іванава***

# ГІСТОРЫЯ ПОДЗВІГУ



**Ішоў пераможны чэрвень 1944 года. Савецкія войскі вялі наступ па ўсіх франтах. Адступаючая фашысцкая армія пакацілася на захад, аднак фашысты люта змагаліся за кожны кавалачак нашай зямлі. Чырвонасцяжная ордэна Суворава Ярцэўская дывізія ў складзе 3-й арміі Беларускага фронту рыхтавалася да наступу і фарсіраванню ракі Бярэзіны ў раёне Ялізава і Свіслачы ў Асіповіцкім раёне.**

**Узвод дывізіённай разведкі пад камандаваннем старэйшага сяржанта Аляксандра Матросава атрымаў задачу: першымі пераправіцца праз Бярэзіну і захапіць мост праз раку Свіслач, які злучае дарогу Бабруйск – Мінская шаша.**

**Уначы з 26 на 27 чэрвеня разведчыкі ўзвода Матросава перапраўляліся праз раку Свіслач у яе вусці на паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі Свіслач, дзе былі размешчаны варожыя доты.**

**Асцярожна, каб не выдаць сябе, разведчыкі падыйшлі да дотаў і, атакаваўшы, уварваліся ў іх, захапіўшы пазіцыі ворага. Фашысты не паспелі апамятацца і арганізаваць супраціўленне. Яго баявыя разлікі былі знішчаны. Па камандзе Аляксандра Матросава разведчыкі занялі ў дотах кругавую абарону і падрыхтаваліся да сустрэчы праціўніка з боку Бабруйска. Аб выкананні задання Матросаў далажыў камандаванню.**

Чакаць праціўніка доўга не прыйшлося. Як толькі немцы даведаліся, што іх важная пазіцыя страчана, яны кінулі на гэты ўчастак вялікія сілы. Значная па колькасці група фашыстаў набліжалася да дотаў, занятыхразведчыкамі Матросава. Вось глуха застрачылі кулямёты, адрывіста і рэзка – аўтаматы. Ворагі дзясяткамі падалі на зямлю, падкошаныя іх агнём. Строй фашыстаў радзеў, але ўпарта працягваў рухацца да дотаў. Яшчэ мацней застрачылі кулямёты. Адкацілася першая хваля атакаваных гітлераўцаў, пакідаючы каля дотаў вялікую колькасць забітых. Панеслі страты і разведчыкі. Загінуў радавы Кармалітаў, некалькі чалавек было цяжка паранена.

Наступіла кароткая перадышка, якую разведчыкі выкарысталі для аказання дапамогі параненым, падрыхтоўку зброі і боепрыпасаў.

Чарговая атака на доты была яшчэ больш напорыстай. Гітлераўцы кінулі ў бой вялікую колькасць пяхоты. Змянілі і тактыку. Наступленне ішло не толькі з фронту, але і з флангаў. Гэта ўскладняла становішча абараняючых доты разведчыкаў, паўстала неабходнасць разгрупаваць агнявыя сродкі. Але камандзір узвода Аляксандр Матросаў быў спакойны, ад яго зыходзіла ўпэўненасць і сіла. І гэта перадавалася байцам ўзвода.

Ад бесперапыннай стральбы ў дотах рабілася цёмна. Парахавы дым рэзаў вочы, не даваў свабодна дыхаць, але байцы змагаліся, не шкадуючы сіл. Атакуючыя немцы залеглі,

прыціснутыя шквалам агню да зямлі. Уважліва назіраючы за імі, разведчыкі ў гэты час набівалі патронамі дыскі, аказвалі дапамогу параненым. Матросаў бачыў, як нямецкі афіцэр падняў руку і пайшоў наперад. І зноў з дотаў па фашыстам ўдарыў бязлітасны агонь.

Нямецкая атака зноў захлынулася. Колькі іх было за дзень, згубіў рахунак і камандзір, і яго байцы. Бой ішоў васемнаццаць гадзін. І каб выстаяць, перамагчы праўзыходныя сілы ворага, запатрабаваліся неймаверныя фізічныя і духоўныя сілы байцоў-разведчыкаў. Фашысты разлічвалі на тое, што разведчыкі не вытрымаюць такога націску. Яны памыліліся. Перад імі стаялі патрыёты, беззаветна адданыя Радзіме, начале з сяржантам Матросавым.

Толькі ўвечары на дапамогу разведчыкам прыйшлі палкі дывізіі, якія да 30 ліпеня на гэтым плацдарме працягвалі весці баі з вялікімі сіламі ворага, якім удалося прарвацца з бабруйскага“катла”.

За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях за пераправу праз раку Свіслач, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР 24 сакавіка 1945 года старшаму сяржанту Аляксандру Аляксеевічу Матросаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.



за Отвагу

Наградной лист

390

Фамилия, имя, отчество Матросов Александр Алексеевич

Воинское звание Ст. сержант Должность, часть пом. комвзвод 94 отдел. разведроты 82 стрелк. д.

Представляется к ордену Славы III степени

1. Год рожд. 1918 г. Националь. Русский 3. Партийн. чл. ВКП(б)

4. С какого времени в Красной армии 3 марта 1939 г.

5. Участие в боях Зап. фронт, Б. ф. 3-й прибалтийский фронт Отечественной войны с июня 1941 г.

6. Имеет ли ранения и контузии Легко ранен 28.2.1944

7. Чем ранее награжден Медаль За отвагу пр. 82 сдк № 013 от 17.9.43

8. Каким РВК призван Ивановским ГВК Ивановск. обл.

9. Постоянный домашний адрес

Краткое изложение личного боевого подвига или заслуг

Тов. Матросов в ночь с 12 по 13 октября участвовал в группе, которая получила задание от командования дивизии, вести разведку по преследованию отступающего пр-ка в районе города Рига.

Тов. Матросов вместе с остальными разведчиками с ходу форсировал канал между озерами: Киш-Эзерс и Югла-Эзерс первыми ворвались в город Рига о чем немедленно было сообщено по радио командованию. Своим быстрым и внезапным броском вперед группа дала возможность нашим передовым частям форсировать канал и ворваться в гор. Рига.

Поставленная задача командованием была выполнена, группа без потерь вернулась обратно.

Тов. Матросов достоин правительственной награды ордена Славы III степени

Командир 94 орр капитан (подпись) (Агеенков)

19.10.44 г.

# ЛІТАРАТУРА


1. Матросов Александр Алексеевич – Герой Советского Союза, отличился в боях за Осиповичи // Их именами названы...– Мн., 1987. – С.408-409.
2. Матросов А. А. // Герои Советского Союза: краткий биограф словарь. В 2т. Т. 2. – Мн., 1987. – С.56.
3. Матросов А. А. // Навечно в сердце народном. – Мн., 1984. – С.342.
4. Матросов Александр Алексеевич [Электронный ресурс] /ПомниПро : электронный мемориал. – М., 2011-2014. – Режим доступа :http://www.pomnipro.ru/memorypage26650/biography
5. Матросов Александр Алексеевич [Электронный ресурс] / Герои страны : интернет проект. – Минск, 2000-2013. – Режим доступа :http://www.warheroes.ru
6. Матросов Александр Алексеевич[Электронный ресурс] / Иваново помнит :авторский интернет проект. – Иваново, 2007-2014. – Режим доступа :http://ivanovo1945.ru/bio/g107.html